УДК 94(438+47) "1918":327(438+47)"1918"

М. М. Мязга

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

НАБЫЦЦЁ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ПОЛЬШЧАЙ У 1918 г. І ПЫТАННЕ АДНАЎЛЕННЯ ЎСХОДНІХ ГРАНІЦ 1772 г.

У артыкуле разгледжаны канцэпцыі асноўных палітычных плыняў Польшчы ў час адраджэння незалежнасці дзяржавы адносна польскай усходняй граніцы і іх эвалюцыя ў час польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў. Зроблены вывад аб адсутнасці імкнення да аднаўлення Польшчы ў граніцах 1772 г. сярод палітычных партый і плыняў, якія мелі значны ўплыў у польскім грамадстве.
Аднаўленне незалежнасці Польскай дзяржавы восенню 1918 г. паставіла пытанне аб яе граніцах. У савецкай гістарыяграфіі літаральна з моманту яе ўзнікнення пануючым стаў пункт гледжання, згодна якому правячыя колы адрадзіўшайся Польшчы ўзялі курс на ўсталяванне граніц 1772 г. [1, с. 4, 5; 2, с. 7]. Пры гэтым даказвалася, што да названай мэты, толькі некалькі рознымі метадамі, імкнуліся як прыхільнікі інкарпарацыі, так і прыхільнікі федэрацыі [3, 86–87]. У далейшым дадзеная канцэпцыя атрымала шырокае распаўсюджанне ў савецкай гістарыяграфіі. Гэты пункт гледжання прысутнічае і ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Так, аўтары 5 тома —Гісторыі Беларусі   ў 6 тамах адзначаюць, што польскія кіруючыя колы патрабавалі аднаўлення граніц, што існавалі да 1772 г. [4, с. 72]. У той жа час сучасная польская гістарыяграфія падкрэслівае, што сярод значымых палітычных сіл Польшчы ні адна не ставіла задачу адраджэння краіны ў граніцах 1772 г. [5, s. 363–364]. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем высветліць ці сапраўды палітычная эліта адрадзіўшайся Польскай дзяржавы ставіла мэту дасягнуць граніц Рэч Паспалітая да яе падзелаў. Адзін з першых дакументаў, у якім былі сфармуляваны тэрытарыяльныя прытэнзіі маючай адрадзіцца Польшчы – дэкларацыя Р. Дмоўскага да міністра замежных спраў Англіі А. Бальфура ад 30 сакавіка 1917 г. Ён прапанаваў правесці ўсходнюю граніцу Польшчы па лініі Вільна, Дзвінск, Мінск, Пінск, Роўна, Камянец-Падольскі [6, s. 54, 56]. Р. Дмоўскі лічыў прапанаваны ім варыянт граніцы кампрамісным, бо значаная частка —гістарычнай Польшчы   павінна была застацца за межамі Польскай дзяржавы, але пры гэтым яна павінна ўключыць тыя правінцыя, дзе, згодна яго меркаванню, заходняя (польская) цывілізацыя пусціла глыбокія карані [7, s. 57]. На думку Р. Дмоўскага, стварэнне Польшчы ў граніцах 1772 г. адпавядала б інтарэсам усіх народаў Усходняй Еўропы, бо абараняла б іх ад нямецка экспансіі. Але ѐн адзначаў, што Расія павінна ўтрымаць прыкладна тыя тэрыторыі, якія яна атрымала па раздзелах рэчы Паспалітай у 1772 і 1793 гадах, а ў склад Польшчы павінны былі ўвайсці губерні Ковенская, Віленская, Гродзенская, большая частка Мінскай, Валынь, два паветы Падольскай [8, s. 48–51]. Лагер Ю. Пілсудскага па пытанню польскай усходняй граніцы на пачатку польска-савецкай вайны быў блізкі да пазіцыі эндэцыі, як гэта паказалі перамовы прадстаўніка Польскага нацыянальнага камітэта (ПНК) С. Грабскага з Ю. Пілсудскім у Варшаве ў снежні 1918 г. 16 снежня С. Грабскі паведаміў ПНК, што на перамовах начальнік дзяржавы выказаўся за граніцу, якая павінна праходзіць па лініі Ула, Бярэзіна, Случ, Гарынь. Гэта было блізка да —лініі Дмоўскага   і азначала непасрэднае ўключэнне асноўнай часткі Беларусі ў склад Польшчы [9, с. 185]. Л. Васілеўскі адзначаў, што —ў адносінах усходняй граніцы Пілсудскі ў цэлым пагаджаўся з лініяй, прапанаванай Дмоўскім   [10, s. 172]. 58 Далейшы этап барацьбы Польшчы за свае граніцы звязаны с дзвюма падзеямі, якія пачаліся амаль адначасова: Парыжская мірная канферэнцыя і польска-савецкая вайна. Польская дэлегацыя, якая прыбыла ў Парыж, у аснову пазіцыі сваѐй краіны па пытанню аб граніцы паклала —лінію Дмоўскага  . 29 студзеня на пасяжэнні Савета дзесяці выступіў старшыня польскай дэлегацыі Р. Дмоўскі. Ён заявіў, што —ў 1772 г. Польшча на ўсходзе распасціралася да Дняпра і Дзвіны  . На гэтай тэрыторыі —асноўная частка вясковага насельніцтва няпольская па нацыянальнасці, і яго ўключэнне ў склад Польшчы выклікала б значныя цяжкасці  . Таму яе ўсходняя мяжа павінна прайсці такім чынам, —каб пакінуць Расіі няпольскае насельніцтва  , і Польшча —не без шкадавання   гатова адмовіцца ад —часткі сваіх тэрыторый, якія калісьці належалі ѐй   [9, с. 215, 216]. Такім чынам, польская

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэлегацыя заявіла перад саюзнымі дзяржавамі, што адрадзіўшаяся Польшча не мае намеру дабівацца вяртання да тых граніц, якія Рэч Паспалітая мела да падзелаў. Для вырашэння пытання аб польскіх граніцах на канферэнцыі была створана спецыяльная камісія на чале з французскім дыпламатам Ж. Камбонам. 25 лютага Р. Дмоўскі накіраваў яму ноту, у якой зноў выклаў пазіцыю польскай дэлегацыі па пытанню граніц Польшчы. Ён заявіў, што зыходным пункта сваіх патрабаванняў Польшча прымае граніцу 1772 г. і —і лічыць сваім свяцейшым правам вярнуць тое, што сілай забралі дзяржавы, якія цяпер ляжаць у руінах . Але далей Р. Дмоўскі заяўляў, што Польшча не збіраецца цалкам выкарыстаць гэтае права, бо ўсведамляе, што на працягу —мінулых 150 гадоў з моманту падзелу Польшчы на нашых усходніх межах адбыліся змены, з якімі мы павінны лічыцца . Матывуе сваю пазіцыю Р. Дмоўскі тым, што ўключэнне вялікіх тэрыторый на ўсходзе —не прынесла б карысці будучай Польшчы. Мы зусім не хочам уключаць у склад нашай дзяржавы элементы, якія немагчыма асіміляваць . У сувязі з гэтым да Польшчы трэба далучыць толькі тыя землі, дзе высокі працэнт польскага насельніцтва. Адпаведна, яна адмаўлялася ад усёй Кіеўскай, амаль ад усёй Падольскай, большай часткі Валынскай, ад усёй Магілёўскай, большай часткі Віцебскай, двух паветаў Віленскай губерні [9, с. 228]. Сваю пазіцыю па пытанню граніцы Р. Дмоўскі тлумачыў на пасяджэнні ПНК 2 сакавіка 1919 г. Ён зноў заявіў аб адмове Польшчы ад граніцы 1772 г. на ўсходзе, падкрэсліўшы, што лепш некалькі зменшыць тэрыторыю Польшчы, але зрабіць яе здольнай да існавння [11, s. 34–35]. 3 сакавіка польская дэлегацыя звярнулася да мірнай канферэнцыі з новай нотай, у якой яшчэ раз дэталёва былі выкладзены патрабаванні адносна граніцы. Падкрэслівалася, што Польшча, —хоць і са шкадаваннем , адмаўляецца ад усходняй часткі Беларусі, бо —далучэнне гэтых правінцый да Польшчы парушыла б яе цэласнасць . Далей падрабязна апісвалася лінія будучай польскай граніцы, якая павінна была прайсці на захад ад Віцебска і Магілёва і на ўсход ад Мінска і Мазыра [9, с. 252], гэта значыць – заходней граніцы 1772 г. Фактычна на Парыжскай канферэнцыі польская дэлегацыя адстойвала пазіцыю эндэцыі па пытанню граніцы, у аснове якой у красавіку 1919 г., як аргументавана адзначае сучасны польскі даследчык А. Чубінскі, ляжала лінія другога падзелу і ідэя інкарпарацыі. Р. Дмоўскі тлумачыць пазіцыю эндэцыі па пытанню ўсходняй граніцы ў той час у лісце С. Грабскаму ад 19 мая 1919 г. На яго думку, гэтая палітыка не павінна рабіць немагчымым пагадненне з Расіяй. Таму не трэба гаварыць пра ВКЛ у граніцах 1772 г., звязваць сябе палітыкай падтрымкі Украіны, а неабходна стаяць на пазіцыі падзелу ўсходніх —крэсаў  з Расіяй [8, s. 145–146]. У Варшаве ва ўмовах пачынаўшайся польска-савецкай вайны таксама ішло актыўнае абмеркаванне пытання польскай усходняй граніцы. 24 лютага на пасяджэнні сейма выступіў прэм'ер-міністр І. Падарэўскі. Ён адзначыў, што невыгаднае геаграфічнае становішча Польшчы, якая знаходзіцца паміж —двума магутнымі і варожымі суседамі , патрабуе ад яе прыняцця мер па забеспячэнню сваёй бяспекі. У якасці такой меры ён назваў —стварэнне палітычнай і ваеннай лініі граніцы, якая пройдзе па лініі рэк Дзвіна і Днепр і будзе той граніцай, якая аддзеліць палякаў ад камуністычнай пагрозы з усходу  [12, с. 268–269]. Як бачым, у прамове І. Падарэўскага гаворка ідзе пра граніцу па Дняпры і Дзвіне, што можна разглядаць як імкненне мець граніцы, блізкія да граніц Рэчы Паспалітай 1772 г. Але ўжо 22 59 мая прэм'ер-міністр ўнёс карэктывы ў сваю пазіцыю. Ён заявіў, што Польшча не адмаўляе літоўцам, беларусам і ўкраінцам у праве на незалежнасць, а канчатковые межы Польшчы будуць вызначаны на мірнай канферэнцыі [9, с. 301]. Тут мы ўжо не бачым у пазіцыі І. Падэрэўскага імкнення да граніц 1772 г. Ваганні адносна лініі ўсходняй граніцы Польшчы заўважны ў гэты час і ў пазіцыі польскага сейма. 29 красавіка ён прыняў рэзалюцыю, у якой падтрымаў ідэю інкарпарацыі [8, s. 118, 122], а ўжо 23 мая ў новай рэзалюцыі выказаў падтрымку федэралісцкай пазіцыі, заявіўшы, што нават тыя тэрыторыі былога ВКЛ, дзе пераважае польскае насельніцтва, маюць права на самавызначэнне [9, с. 303]. Далей паспрабуем вызначыць, якую пазіцыю па пытанню граніцы на пачатковым этапе польска-савецкай вайны займаў Ю. Пілсудскі. Як вядома, у Віленскай адозве 22 красавіка 1919 г. ён заявіў аб права народаў былога ВКЛ самастойна вырашаць свой лёс і фактычна выказаў спадзяванне на ўтварэнне федэрацыі гэтых зямель з Польшчай [13, s. 84]. 4 мая 1919 г. ён пісаў Л. Васілеўскаму аб недапушчальнасці падзелу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Беларусі паміж Польшчай з Расіяй [13, s. 75–76]. Гэта зноў жа азначала рэалізацыю прынцыпа федэрацыі ў дачыненні да беларускіх зямель. Але пры гэтым заходнюю і цэнтральную частку Беларусі намячалася ўключыць у склад Польшчы непасрэдна, аб чым Ю. Пілсудскі, як мы бачылі, гаварыў яшчэ ў час перамоў са С. Грабскім ў снежні 1918 г. У інструкцыі Л. Васілеўскаму, які ад'язджаў на Парыжскую канферэнцыю, Ю. Пілсудскі ўказваў, што ―ўсходняя граніца павінна забяспечыць польскаму боку чыгунку Драгобыч – Львоў – Ковель – Пінск – Лунінец – Баранавічы – Вільня і яе прыкрыццѐ ў выглядзе пояса лясоў і балот Прыпяці [14, с. 56] У чэрвені 1919 г. цесна звязаны з Ю. Пілсудскім польскі генеральны штаб распрацаваў праект стварэння аўтаноўнай акругі ў складзе Мінскай і Магілѐўскай зямель. Уся тэрыторыя на захад ад яе павінна была ўвайсці ў склад Польшчы [15, с. 52]. У гэты час канцэпцыю федэрацыі пачынае адтойваць і польская дэлегацыя на Парыжскай мірнай канферэнцыі, пасля таго, як яе ўзначаліў прэм'ер-міністр І. Падарэўскі. 5 чэрвеня ў звароце да ўдзельнікаў канферэнцыі ѐн заявіў, што Польшча прызнае права народаў былога ВКЛ на самавызначэнне і імкнецца да аб'яднання з імі ―на аснове агульных палітычных, эканамічных і культурных інтарэсаў  [9, с. 303]. У інструкцыі польскага МЗС ад 7 ліпеня 1919 г. зроблена спроба сумясціць ідэі федэрацыі і інкарпарацыі. Спачатку ў ѐй заяўлялася пра правы Польшчы на граніцы 1772 г. Але далей адзначалася, што з улікам пермен, якія адбыліся на ўсходніх ―крэсах , Польшча павінна пакінуць за сабой толькі тую частку зямель, ―якія з'яўляюцца этнаграфічна польскімі, або маюць досыць значны працэнт польскага насельніцтва, з'яўляюцца польскімі цывілізацыйна . Пытанне федэрацыі ў гэтым дакуменце разглядалася з пункту гледжання магчымасці далучэння да Польшчы ўсѐй або нязначана зменшанай тэрыторыі былога ВКЛ ―пры дапамозе ўніі ці федэрацыі  Заўважым, што гаворка ідзе пра тое, каб ―далучыць гэтыя тэрыторыі да Польшчы  з дапамогай федэрацыі [9, с. 330]. Адпаведна, ѐсць падставы сцвярджаць, што Польская дзяржава не планавала непасрэдна дасягнуць граніц 1772 г., але яе кіраўніцтва разлічывала, што іх будзе мець федэрацыя на чале з Польшчай. Восенню 1919 г. Ю. Пілсудскі ўдакладніў сваю пазіцыю адносна земель былога ВКЛ у час перамоў з беларускімі дзеячамі. У ходзе іх ішла гаворка аб стварэнні толькі ―беларускага П'емонта  з правамі культурнай аўтаноміі на абмежаванай тэрыторыя, якая ўключала Мінск і землі на ўсход ад яго. Астатняя беларуская тэрыторыя павінна была непасрэдна ўвайсці ў склад Польшчы [8, s. 185–186]. У снежні 1919 г. сакратар Ю. Післудскага Світальскі запісаў наступнае яго высказванне: «Анексіянісцкую і федэралисцкую канцэпцыі не трэба супрацьпастаўляць адну другой, адна не выключае другую; трэба толькі паставіць федэралістскую канцэпцыю на першы план, каб у выпадку, калі яе не ўдасцца ажыццявіць, застаўся другі выхад [16, с. 262]. 16 студзеня 1920 г. у гутарцы з прадстаўнікам расійскіх эсераў Ю. Пілсудскі заявіў, што Расія павінна адмовіцца ад граніцы 1914 г., а Польшча – 1772 г. [8, s. 182]. На думку С. Грабскага ніхто з польскіх тагачасных палітычных правадыроў не імкнуўся да аднаўлення Польшчы ў граніцах 1772 г., 60 у тым ліку і Ю. Пілсудскі. Ён хацеў не столькі пашырыць усходнія межы Польшчы, колькі адсунуць як найдалей на ўсход Расію і адгарадзіцца ад яе саюзніцкімі дзяржавамі [17, с. 267]. У сувязі з савецкімі мірнымі прапановамі да Польшчы ў пачатку 1920 г. Ю. Пілсудскі пагаджаўся пачаць іх пры умове, што зыходным пунктам пазіцыі польскай дэлегацыі будзе граніца 1772 г. Далей дэлегацыя магла пайсці на сатупкі, і прапанаваць граніцу, якая праходзіла б паміж лініяй 1772 г. і Бярэзінай. Як лічыць А. Чубіньскі, размовамі пра граніцу 1772 г. Ю. Пілсудскі, які рыхтаваў кіеўскі паход, проста хацеў сарваць мірныя перамовы [8, s. 196, 200]. А. Латышонак выказвае меркаванне, што Ю. Пілсудскі размовы пра граніцу 1772 г. трактаваў як элемент шантажу на перамовах з бальшавікамі [18, с. 17] і, дадзім, з палітычнымі апанентамі маршала. У лютым 1920 г. быў заключаны кампраміс паміж С. Грабскім і блізкім да Ю. Пілсудскага прэм'ер-міністрам Л. Скульскім. Згодна яму начальнік дзяржавы адмаўляўся ад патрабавання граніц 1772 г. узамен за падтрымку планаў кіеўскага паходу [19, s. 49]. Так што размовы пра граніцу 1772 г. у рамках федэрацыі былі для Ю. Пілсудскага не столькі рэальнай мэтай, колькі сродкам палітычнага гандлю. 8 сакавіка 1920 г. на пасяджэнні польскага ўрада з удзелам Ю. Пілсудскага было прынята рашэнне аб непасрэдным уключэнні Гродзеншчыны і Віленшчыны ў склад Польшчы, а ў ―Мінскай акрузе і на атрыманых далей на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўсход землях трэба зрабіць беларусам саступкі ў галіне самакіравання і культуры [20, с. 125]. Аднак як далёка на ўсход пройдзе граніца гэтай акругі вызначана не было. Летам 1920 г. адбываецца далейшая карэктыроўка польскай пазіцыі адносна ўсходняй граніцы. 8 чэрвеня міністр замежных спраў С. Патэк адзначаў, што Польшча ў пытанні ўсходняй граніцы зыходзіць з неабходнасці —дэзанексіі ад Расіі зямель Рэчы Паспалітай да 1772 г. Але непасрэдна ў склад Польшчы будуць уключаны толькі тэрыторыі, —дзе этнічны склад мясцовага насельніцтва не выклікае ніякіх сумненняў у плане польскай большасці. У дачыненні да астатніх тэрыторый намячалася прытрымлівацца права нацый на самавызначэнне і, у прыватнасці, стварыць украінскі ўрад і перадаць пад яго ўладу ўкраінскія землі [17, с. 61]. Польская дыпламатыя, такім чынам, не ставіла ў той момант задачу дасягнуць граніц 1772 г. і ўжо не вяла гаворку пра Літоўска-Беларускую дзяржаву ў уніі з Польшчай. У ходзе падрыхтоўкі да перамоў у Рызе 27 жніўня 1920 г. на пасяджэнні Рады абароны дзяржавы (РАД) было прынята рашэнне дабівацца граніцы па лініі Дзвінск – Вільна – Баранавічы – Лунінец – р. Гарынь – р. Збруч, паколькі на ѐй знаходзяцца гатовыя інжынерныя збудаванні. Гэтую мяжу падтрымаў і Ю. Пілсудскі. Дадзеная лінія граніцы была пацверджана на пасяджэнні РАД і 11 і 25 верасня. Хаця на апошнім пасяджэнні была зроблена агаворка, што гэта лінія мінімальных патрабаванняў, і канчатковае рашэнне павіна прымаць дэлегацыя непасрэдна на перамовах [21, с. 116, 120, 121]. Польская дэлегацыя настойвала на перадачы Польшчы чыгункі Сарны – Лунінец – Баранавічы – Ліды і шырокай паласы на паўночны ўсход ад яе. У якасці альтэрнатывы прапаноўваўся вывад усіх замежных войск с тэрыторыі Беларусі і абвяшчэенне яе незалежнасці з заходняй граніцай па —лініі Керзана [22, с. 10]. Частка членаў дэлегацы не страціла надзеі на рэалізацыю федэратыўнай канцэпцыі і выступала за ўключэнне ў склад Польшчы Мінска. Але гэты пункт гледжання не знайшоў падтрымкі большасці [17, с. 265, 295]. Як лічыць К. Гамулка, Ю. Пілсудскі не згаджаўся з лініяй рыжскай граніцы [21, с. 124], што і знайшло адлюстраванне ў пазіцыі яго прыхільнікаў у складзе польскай дэлегацыі. Зафіксаваная ў прэлімінарным дагаворы граніца была далѐкай ад лініі 1772 г. і нават —лініі Дмоскага . Большая частка ўсходніх —крэсаў пераходзіла пад кантроль Расіі. У ходзе далейшых перамоў савецкім бокам былі зроблены яшчэ некаторыя тэрытарыяльныя саступкі, але яны ўжо не мянялі істотна лінію польска-савецкай граніцы і пакідалі яе далѐкай ад граніцы 1772 г. [17, с. 253]. Характэрна, што пры ратыфікацыі Рыжскага дагавора не пратэставала ні адна партыя, хоць Ю. Пілсудскі і лічыў, што ваенныя дзеянні былі спынены залішне паспешліва [23, s. 9]. Такім чынам, прыхільнікі інкарпарацыі ў палітычных колах Польшчы максімыльныя тэрытарыяльныя патрабаванні сфармулявалі ў —лініі Дмоўскага , якая праходзіла значна 61 ўсходней граніцы Рэчы Паспалітай напярэдадні падзелаў. Гэтую лінію ў цэлым падтрымаў і Ю. Пілсудскі, і адстойвала польская дэлегацыя на Парыжскай канферэнцыі. У далейшым правыя польскія палітыкі лінію ўсходняй краіны паступова адсоўвалі на захад, да лініі нямецкіх акопаў 1915 г. Гаварыць пра планы дасягнення граніцы 1772 г. можна ў рамках рэалізацыі канцэпцыі федэрацыі, але не непасрэдна Польскай Рэспублікай, а тым федэратыўным утварэннем, якое павінна было ўзнікнуць на ўсходніх —крэсах . У пачатку 1920 г. Ю. Пілсудскі мадэрнізаваў федэратыўны план, прыняўшы ў дачыненні да Беларусі канцэпцыю інкарпарацыі, якую прапаноўвалі правыя партыі. На Украіне планавалася стварэнне фармальна незалежнай буфернай дзяржавы. Адбылася адмова ад дасягнення граніц 1772 г. і ў рамках федэрацыі. На перамовах у Рызе і была зафіксавана мяжа, згодна якой большая частка былых усходніх —крэсаў апынулая пад кантролем Расіі. Крыніцы і літаратура 1. Павлович, М. П. Война с польскими панами (Польско-шляхетская авантюра) / М. Павлович. – М., 1920. – 32 с. 2. Кислянский С. С. Фронт и тыл в борьбе с польскими белогвардейцами. – М. : Типография III Интернационала, 1920. – 16 с. 3. Пічэта У. Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір // Полымя. – 1928. – № 5. – с. 85 4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. – Мінск: Современная школа, 2007. – 616 с. 5. Achmatowicz, A. Traktat ryski w kontekście polsko-rosyjskiego konfliktu i ego znaczenie dziejowe / A. Achmatowicz // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach. Studia pod red. M. Wojciehowskiego. –Toruń: Wyd. UMK, 1998. – S. 361–370. 6. Wskreszenie Panstwa Polskiego. Szkic historyczny. T.2. 1918 - 1923. - Krakow: Krakowska Supolka Wydawnicza, 1925. - 300 s. 7. Dmowski, R. Politzka Polska i odbudowanie

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Panstwa. Wydanie drugie / R. Dmowski. – Warszawa: Nakładem księgarni Perzyński, Niklewiecz i s-ka, 1926. – 534 s. 8. Czubiński A. Walka Jòzefa Pilsudskiego o nowy kształt polityczny Europy SrodkowoWschodniej w latach 1918–1921. – Toruń: Wydawnictwo Adam Marczałek, 2002. – 444 s. 9. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.) Зборнік дакументаў і матэрыялаў. У 4 т. Т. 1. Ч. 1. – Мінск: «Юніпак», 2008. – 539 с. 10. Wasilewski, L. Józef Piłsudski. Jakim Go znalem / L. Wasilewski. – Warszawa: Wyd. —Rój , 1935. – 235 s. 11. Kowalec, K. Narodowa demokracja wobec traktatu ryskiego / K. Kowalec // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach. Studia pod red. M. Wojciehowskiego. – Torun: Wyd. Uniwersytetu Mikolaja Kopernika, 1998. – S. 31–46. 12. Кравчук, О. Ігнаці Ян Падеревький: патріот, митець, державний діяч Польші // Україна і Польща: історичне сусідство. Матеріали Міжнародної наукової конференції 17–18 травня 2012 р. – Вінница, ТОВ «Нілан ЛДТ», 2012. – 636 с. С. 262–277. 13. Piłsudski, J. Pisma zbirowe. T. 5. – Warszawa: Instytut J. Pilsudskiego, 1922. – 297 s. 14. Даркович, А. Л. Западнобелорусские замли в политике польского государства в 1919– 1926 годах (на примере городского самоуправления белорусского Полесья) // Славяноведение. – 2010. – № 4. – С. 55–66. 15. Симонова, Т. М. Прометеизм во внешней политике Польши. 1919 – 1924 // Новая и новейшая история. – 2002. – № 4. – С. 47–63. 16. Матвеев Г. М. Пилсудкий / Г. Ф. Матвеев. – М. : Молодая гвардия, 2008. – 474 с. 17. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.) Зборнік дакументаў і матэрыялаў. У 4 т. Т. 1. Ч. 2. – Мінск: «Юніпак», 2008. – 394 с. 18. Latyszonek, O. Bialoruski odcinek granicy polsko-sowieckiej z lat 1920–1939 roku w świetle teorii cywilizacyjnych I geopolitycznych // Спрэчныя пытанні. З гісторыі польска-беларускіх 62 узаемаадносін у 1918–1945. Зборнік навуковых прац II IV міжнародных навуковатэарэтычных канферэнцый. Мінск, 2010–2012 / пад рэдакц. Э. Расоўскага, А. Вялікага. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2013. – С. 13–19. 19. Wojdyło, W. Traktat w Rydze w koncepcjach obozu narodowego ze szczególnym uwzględnieniem roli Stanislawa Grabskiego / W. Wojdyło // Traktat Ryski 1921 roku po 75 latach. –Toruń: Wyd. UMK, 1998. – S. 47–61. 20. Михутина, И. Польско-советская война 1919–1920 гг. – М. : Інстітут славяноведенія і балканісыкі, 1994. – 322 с. 21. Гамулка К. Паміж польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фармаванняў (1918–1922) / К. Гамулка. – Вільня: ЕГУ, 2008. – 256 с. 22. Лазько, Р. Р. Польска-савецкія мірныя перагаворы 1920 г. і лѐс Беларусі // Беларускі гітстарычны часопіс. – 2010. – № 12. – С. 5–11. 23. Wapiński, R. Traktat Ryski a polskie oczekiwania / R. Wapiński // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach. Studia pod red. M. Wojciehowskiego. – Torun: Wyd. UMK, 1998. – S. 9–17 Gaining independence by Poland in 1918 and the issue of restoration of the Eastern borders of 1772. The article describes the concepts of the main political movements of Poland on Polish Eastern border during the revival of the state's independence and their evolution during the Polish-Soviet war of 1919 - 1920. The author made a conclusion about the absence of the aspiration for restoration of Poland's borders of 1772 among the political parties and movements, which had a significant impact in Polish society

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ